Радыё Свабода

ЗДАРЭНЬНІ

У справе «Белгазпрамбанку» кіраўнік БТ Эйсмант убачыў «замежнае ўмяшаньне»

15 чэрвень 2020, 11:01

Старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант заявіў у эфіры тэлеканалу «Беларусь 1», што за справай «Белгазпрамбанку» стаіць «нешта большае, чым проста фінансавыя справы Бабарыкі і яго калегаў».

Гаворачы пра крымінальную справу ў дачыненьні да кіраўніцтва «Белгазпрамбанку», які да нядаўняга часу ўзначальваў прэтэндэнт у кандыдаты на пасаду прэзыдэнта Віктар Бабарыка, кіраўнік БТ ня выключыў «замежнага ўмяшаньня ў беларускія справы».

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
«Нягоднік», «рыльца ў пушку», «адна шайка-лейка». Лукашэнка атакаваў Бабарыку, па справе «Белгазпрамбанку» затрымалі 15 чалавек

«Можна зрабіць выснову, што за ўсёй гэтай гісторыяй стаіць нешта большае, чым проста фінансавыя справы Бабарыкі і яго калегаў. Паводле той інфармацыі, якуюмы маем, назіраюцца спробы замесьці сьляды, што, напэўна, лягічна. Відавочна, што справа ідзе да абнародаваньня куды больш сур'ёзных фактаў у куды больш сур'ёзных катэгорыях. Напрыклад, факт умяшаньня замежнай дзяржавы ў беларускія ўнутраныя справы», — заявіў Эйсмант, не назваўшы пры гэтым самую «замежную дзяржаву».

11 чэрвеня ў галоўны офіс «Белгазпрамбанку» прыйшлі супрацоўнікі Дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў Камітэту дзяржаўнага кантролю. Пазьней зьявілася інфармацыя аб затрыманьні 15 чалавек: топ-мэнэджэраў зь ліку кіраўнікоў першага зьвяна, а таксама былых супрацоўнікаў банку.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
У «Белгазпрамбанку» забралі знакамітую калекцыю карцін на 20 млн даляраў

Пачатыя дзьве крымінальныя справы: паводле арт. 235 КК (Легалізацыя сродкаў, здабытых злачынным шляхам у асабліва буйным памеры) і арт. 243 КК (Ухіленьне ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры). Сканфіскаваныя буйныя сумы ў валюце, каштоўныя паперы, карціны з карпарацыйнай калекцыі. Агулам — прыкладна на 20 мільёнаў даляраў.

15 чэрвеня экс-старшыня Нацыянальнага банку Надзея Ермакова ўзначаліла новую часовую адміністрацыю «Белгазпрамбанку».

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Нацыянальны банк прызначыў у «Белгазпрамбанку» часовую адміністрацыю на чале зь Ермаковай

Расейскія акцыянэры — «Газпромбанк» і «Газпром» — ужо заявілі аб парушэньні заканадаўства Нацыянальным банкам Беларусі пры зьмене кіраўніцтва і будуць дамагацца абароны сваіх правоў і законных інтарэсаў усімі даступнымі праўнымі сродкамі.

Прэзыдэнцкія выбары — 2020 у Беларусі. Што важна ведаць

- Шостыя ў гісторыі сувэрэннай Беларусі выбары прэзыдэнта прызначаныя на нядзелю, **9 жніўня 2020 году**.
- 65-гадовы **Аляксандар Лукашэнка** кіруе дзяржавай 25 гадоў. Ніводныя прэзыдэнцкія выбары (2001, 2006, 2010, 2015), апроч першых (1994 год), не прызналі свабоднымі і справядлівымі на міжнародным узроўні.

- Старшыня ЦВК **Лідзія Ярмошына** адхіліла прапановы праваабаронцаў аб дыстанцыйных прэзыдэнцкіх выбарах у час эпідэміі COVID-19, бо «часу для прыняцьця гэтых захадаў ужо няма». Лукашэнка ня бачыў падставаў пераносіць выбары праз пандэмію.
- ЦВК зарэгістраваў 15 ініцыятыўных груп з 55 заявак.
- Аўтару YouTube-канала «Страна для жизни» **Сяргею Ціханоўскаму** Цэнтральная выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, бо ён адбываў 15 сутак арышту і ня мог асабіста падаць дакумэнты. Тады сваю ініцыятыўную групу ў ЦВК заявіла жонка блогера **Сьвятлана Ціханоўская**.
- 29 траўня на перадвыбарчым пікеце жонкі затрымалі Ціханоўскага і яшчэ 9 чалавек. Лукашэнка казаў пра акалічнасьці затрыманьня за 4 гадзіны да таго, як яно адбылося.
- 11 чэрвеня ў «Белгазпрамбанку» і шэрагу іншых кампаній прайшлі пераТрусы. У Камітэце дзяржкантролю заявілі, што завялі крымінальныя справы аб легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, і аб ухіленьні ад сплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Старшыня КДК **Іван Тэртэль** сьцьвярджаў, што да гэтых спраў мае дачыненьне патэнцыйны кандыдат у прэзыдэнты **Віктар Бабарыка**. Роўна за 4 гадзіны да заявы Дзяржкантролю **Аляксандар Лукашэнка** расказаў пра акалічнасьці «справы „Белгазпрамбанку“».
- 18 чэрвеня Віктара Бабарыку і яго сына, кіраўніка ініцыятыўнай групы Эдуарда Бабарыку затрымалі.
- 14 ліпеня ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі ў прэзыдэнты **Аляксандра Лукашэнку**, **Сьвятлану Ціханоўскую**, **Ганну Канапацкую**, **Андрэя Дзьмітрыева** і **Сяргея Чэрачня**. Не зарэгістравалі **Віктара Бабарыку** і **Валера Цапкалу**.
- Ад пачатку выбарчай кампаніі праваабаронцы налічылі больш за 1300 затрыманых: удзельнікі «ланцугоў салідарнасьці», сябры ініцыятыўных груп, актывісты, палітыкі, блогеры, журналісты і проста мінакі на вуліцы. Сотні чалавек пакаралі адміністрацыйнымі арыштамі і аштрафавалі.